САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

СУБОТА
25 красавіка 1931 г.
№ 93 (3181)

Пачалася сяўба ў паўднёвых раёнах

Не забываць, што позьняя вясна—скарачае тэрміны сяўбы!

Укараненьнем зьдзельшчыны, разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўшчыльніць тэрміны пасеўных работ

Сяўба пачалася

У паўднёвых раёнах Савецкай Беларусі пачалася сяўба. Першымі ў поле вышлі калгасьнікі Ельскага і Камарынскага раёнаў. Яшчэ праз пару дзён у масавую сяўбу ўступіць уся Савецкая Беларусь.

Позьняя вясна скарацила тэрмін сяўбы, але плян вясеньняй пасеўнай кампаніі павінен быць выканан цалкам. Вытворчыя заданьні ня могуць і не павінны быць скарочаны ні на адзін га.

Тэрміны сяўбы скарачаюцца—значыцца павінны быць навышаны тэмпы сяўбы.

Сёньня тэмпы вырашаюць поспех вясеньняй пасеўнай кампаніі, ад якой залежыць у значнай ступені завяршэньне ў бягучым гаспадарчым годзе фундаманту сацыялістычнай эканомікі нашай краіны.

Ці можам мы ўзяць падвоеныя, а калі патроенна будзе, і патроеныя тэмпы сяўбы, ці маюцца ў нас для гэтага неабходныя даны? Так, на гэтыя запытаньні можа быць толькі станоўчы адказ. Тэмпы калектывізацыі сялянскіх гаспадарак, рост энэргаўзброенасьці аграмалажнага сэктару сельскай гаспадаркі, вопыт першай калгаснай вясны, разьвіцьцё ударніцкага руху і соцспаборніцтва ў калгасах і саўгасах—усё гэта стварае самыя спрыяючыя ўмовы для пасьпяховага выкананьня пляну веснавой пасеўнай кампаніі, дае магчымасьць перакрыць скарочаныя тэрміны сяўбы ўдарнай работай на нашых полях. Толькі апартуніст можа ставіць пытаньне аб скарачэньні пасеўных плянаў у сувязі з позьняй вясной, толькі апартуніст—кулацкі агент будзе ў сваёй барацьбе супроць партыі і яе генэральных задач чапляцца за „аб'ектыўныя" прычыны. У рашучай барацьбе з кулаком і апартуністам, у рашучым перамаганьні самацёчных настрояў мы забясьпечым, ня гледзячы на позьні пачатак сяўбы, пасьпяховае выкананьне плянавых заданьняў.

Было-б сьмешна недаацэньваць тыя дадатковыя труднасьці, якія ствараюцца ў сувязі з позьнім пачаткам сяўбы. Адвак, вывад адсюль адзін: яшчэ больш напружыць сілы, яшчэ больш арганізавана працаваць і неадкладна ліквідаваць тыя прарывы, якія на рашаючых вучастках пасеўнага фронту маюцца ў радзе раёнаў.

Ва ўмовах позьняй вясны асаблівае значэньне мае ўмелае скарыстаньне працы калгасьнікаў і цягавай сілы. Зьдзельшчына—асноўнае і рашаючае зьвяно. Разгорнутай масавай растлумачальнай работай вакол пытаньняў, зьвязаных са зьдзельшчынай, трэба перамагчы, разьбіць, ліквідаваць дашчэнту настрої падушнай дзяльбы калгаснага ўраджаю і даходу. Ядовае разьмеркаваньне ўраджаю і даходу—гэты кулацкі козыр супроць калгаснага руху павінен быць выбіт з рук кулака. Зьдзельшчына, правільна ажыцьцёўленая, адыгрывае вялізарнейшую ролю. Яна высока ўзьніме прадукцыйнасьць калгаснай працы. Яна максымальна павялічыць нагрузку машын і цягавай сілы. Яна забясьпечыць посьпех веснавой сяўбы.

На зьдзельшчыне трэба з ўсёй сілай зрабіць упор. Рэальнай пагрозай для пасьпяховага выкананьня задач веснавой пасеўнай кампаніі зьяўляецца тое, што вялікая колькасьць калгасаў нават да гэтага часу яшчэ не перайшлі на зьдзельшчыну. Тут неабходна неадкладная перабудова радоў, неадкладны круты пералом.

Насеньня і фуражныя фонды—вось такі другі рашаючы вучастак пасеўнага фронту. На гэтым вучастку мы маем бясспрэчнае адставаньне, якое адбівае своеасаблівы разрыў паміж узроўнем калектывізацыі і абагуленьнем насенных і фуражных фондаў. Кулацкай агітацыяй супроць унесеньня новымі калгаснікамі пры ўступленьні ў калгас насенных і фуражных фондаў мы павінны супрацьпаставіць масавую растлумачальную работу, мабілізацыю ўсяго калгаснага сялянства і беднякоў і серадняко ў-адзіноасобнікаў на адпор кулацкаму супраціўленьню.

Сяўба пачалася. Хутка ў масавую сяўбу ўступіць уся Савецкая Беларусь. Таму неадкладная ліквідацыя прарываў на аснове яшчэ большага ўздыму хвалі калгаснага прыліву—наша баявая задача.

Позьняя вясна, яна скарачае тэрміны ня толькі сяўбы, але і ўборкі. Таму ўжо зараз-жа, поруч з разгортваньнем сяўбы, неабходна па-баявому рыхтавацца да ўборачнай кампаніі. Ужо неадкладна павінны быць складзены рабочыя пляны ўборачных работ. Ужо зараз трэба рыхтаваць уборачны інвэнтар і г. д. і г. д.

Падвоіць тэмпы сеяць і ўдарна рыхтавацца да ўборкі—вось тая задача, на выкананьне якой неабходна па сапраўднаму мабілізаваць і арганізаваць армію калгаснага сялянства і мільенныя масы беднаты і серадняцтва.

Масавая сяўба ў Ельскім раёне

Ельск. (Наш кор па тэлеграфе). 21 красавіка выехалі ў поле калгасы „Чырвоны Золак", Багуціцкі, імя газэты „Савецкая Беларусь", Вішанькі, „Чырвоны Партызан", Мелешковічы, Санюкі, „Прагрэс" і Дабрынь. 22-23 красавіка па раёне пачалася масавая сяўба.

У буйнейшыя калгасы раёну выехалі сакратар райкому КП(б) тав. Нікалаенка і старшыня РВК тав. Ткачэнка.

Герасіменка.

Абяцаем правесьці сяўбу па-ўдарнаму

Камарына (Па тэлеграфе). Калгас „Савецкая Беларусь" Камарынскага раёну 22 красавіка пачаў сяўбу.

Абяцаем сяўбу правесьці па-ўдарнаму.

Старшыня калгасу
Дзяцел.

Прыхваснi прышчэпаўшчыны арудуюць

У Старадароскім раёне кулакам адводзілі калгасную зямлю

Пры абсьледваньні земляўпарадкаўчых работ, выкананых у мінулую весну па Старадароскім раёне, устаноўлена злачыннае скрыўленьне клясавай лініі і ігнараваньне важнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства, якім зьяўляецца калектывізацыя.

Калегія НКЗ БССР, разгледзіўшы гэтае пытаньне, пастанавіла:

Старэйшага кіраўніка работ Корбута зьняць з работы і аддаць пад суд за злачынную кулацка-шкодніцкую дзейнасьць пры земляўпарадкаваньні калгасаў.

Прапанаваць Старадароскаму РВК абвясьціць суровую вымову райземляўпарадкавальніку Плышэўскаму за пераагаваньне на шкодніцкую дзейнасьць, якую праводзіў старэйшы кіраўнік работ Корбут пры земляўпарадкаваньні калгасаў.

На барацьбу з пасьледзтвамі паводкі!

Разводзьдзе ракі Сьвіслачы ў гор. Менску

Па прагнозах Бюро Навор'я СССР і Галоўнай Геафізычнай Абсэрваторыі намячалася, што рэкі ў БССР ускрыюцца ў першай дэкадзе красавіка, а максымумы узроўняў вады на буйных рэках прыдуцца на час каля 22 красавіка. У сапраўднасьці ўскрыцьцё рэк некалькі спазьнілася і максымумы ўзроўняў вады на Сьвіслачы, на якой ён павінен быў зьявіцца раней, чымся на буйных рэках, выпаў якраз на 22 красавіка.

Узровень вады па Сьвіслачы каля гор. Менску пачаў прыкметна ўздымацца раніцою 21 красавіка. Да 5 гадзін увечары вада паднялася да адзнакі 196,00 м. (над узроўнем мора), што перавышала с рэдні летні ўзровень на 2,35 м. і на 6 см. перавышала максымальны гарызонт вады, які наглядаўся за апошнія 5 год на р. Сьвіслачы ў Менску (адзнакі адносяцца да вадамернага паста каля мосту на Шырокай вул.).

Паводле меркаваньняў Гідрамэтінстытуту магчыма было чакаць далейшага падняцьця вады да адзнакі 196,5-197,0 м. Пад'ём вады ішоў як звычайна ў Менску ў час паўнаводзьдзя вельмі інтэнсыўна. Каля поўначы ўзровень стаў зьнижацца супроць пакаваньняў у 196,57 м., але потым раптам узьняцьце пайшло зноў вельмі інтэнсыўна і каля 6-7 гадзін раніцы 22 красавіка дасягнуў максымуму ў 197,55 м. над узроўнем мора, г. зн. на 3,90 м. сярэдняга летняга. Пасьля гэтага ўзровень некаторы час трымаўся амаль на месцы без усялякіх прыкметных зьніжэньняў. Толькі пасьля поўдню пачалося зьніжэньне ўзроўню і да 12 гадз. уначы 22 красавіка вада зьнізілася да 3.56 м. над сярэднім летнім. З 12 гадз. уначы 22 красавіка ўзроўні пачалі зноў уздымацца і далей да 6 гадз. раніцы 23 красавіка новае павышэньне на 11 см., дасягнуўшы вышыні 3,67 м. над сярэднім летнім. Гэты прамежак часу быў вельмі напружаны, бо па прагнозу на 23 красавіка ў нашым раёне чакаліся шквалістыя дажджы. Гэтых дажджоў відаць было мала і ўздым ад іх аказаўся нязначным.

Пасьля 6 гадзін раніцы 23-га ўзровень стаў падаць спачатку павольна (па 2-3 см. у гадз.), а потым, пачынаючы з 11 гадз. па 5-8 см. у гадзіну. Да другой гадзіны 23 красавіка ўзровень упаў да 3,30 м. над узроўнем сярэдніх летніх.

Пры такіх тэмпах паданьня вады ўзровень за наступныя сутки відаць зьнізіцца яшчэ на 1,4 мэтры. Тады ўзровень будзе перавышаць сярэдні летні ўсяго на 2 м., г. зн. будзе ніжэ, чымся ўвечары 21 красавіка.

Прагноз на 24 красавіка прадугледжвае надвор'е з праўдападобным падвышэньне тэмпэратуры.

Таму трэба чакаць, што спаданьне ўзроўняў будзе відавочна працягвацца без перашкод.

Лейзінаў.

Менскія ТДА-Авіахімаўцы напагатове

Паводле паведамленьня сакратара Менскага Гарадзкога Савету тав. Новасёлава аб барацьбе з паводкаю ў Менску 22-IV 31 г. паведамлена ў ЦС наступнае: 1) Гарсавет зьвязаўся з камісіяй па барацьбе з паводкаю; 2) атрады і каманды дзяжурацъ; 3) у выпадку патрэбы ў жывой сіле маюцца напагатове астатнія каманды атраду, а таксама ўневайскавікі; 4) па першаму запатрабаваньню тройкі ТДА-авіяхімаўцы Менску зьявяцца на дапамогу стыхійным бядотам ад паводкі.

Вераб'ёва.

5000 рублёў дзецям

пацярпеўшым ад паводкі

Прэзыдыумам Цэнтральнай Камісіі Дапамогі Дзецям пры ЦВК БССР адпушчана 5000 рублёў (грашыма і абмундыраваньнем) на аказаньне дапамогі дзецям, пацярпеўшым ад паводкі гр-н гор. Менску.

Зьвесткі аб ходзе паводкі за прамежак часу з 20 па 24 красавіка па наступных пунктах для тэрыторыі БССР

Рака	Пункт нагляданьня	Павышэньне ўзроўню з пачатку падъему да 23-24	Павышэньне ўзроўню з 20 па 23-24	Максымальны гарызонт стаіць вышэй або ніжэй: сярэдняга максымальнага	Максымальны гарызонт стаіць вышэй або ніжэй: максымальнага, які калі-небудзь наглядаўся	Заўвага
Дняпро	Ворша	8.64	7.14	выш. 3.24	ніж. 0.37	Узровень дан на 22-IV
Дняпро	Жлобін	1.22	0.32	выш. 0.02	„ 0.93	
Дняпро	Лоеў	3.20	2.00	ніж. 0.42	ніж. 2.85	
Бярэзіна	Барысаў	2.79	1.49	выш. 0.09	„ 1.96	на 23-IV
Бярэзіна	Бярэзіно	—	2.18	—	—	
Сож	Прапойск	—	3.22	—	—	
Сож	Гомель	4.26	3.06	выш. 0.76	ніж. 1.04	
Прыпяць	Тураў	—	0.99	—	—	
Прыпяць	Мазыр	0.90	0.10	ніж. 150	ніж. 230	
Зах. Дзьвіна	Віцебск	—	6.92	—	—	

Заг. аддз. Гідра-мэтэаралёгічнага Інстытуту ДАЛОВІЧ.

Мабілізаваць масы на ліквідацыю вынікаў паводкі

(Гутарка са старшынёй Менгарсавету т. Валодзька)

Ня гледзячы на тое, што з боку Гарсавету былі прыняты ўсе магчымыя меры папярэджаньня паводкі, нябачны да гэтага часу разьліў р. Сьвіслач паставіў нас перад тварам вялізарнай небясьпекі. Прынятыя папярэднія меры аказаліся недастатковымі. Але дзякуючы безадкладнаму пераключэньню апарату Гарсавету і рабочых Менску на барацьбу з паводкай удалося ў значнай ступені небясьпеку адхіліць.

Трэба адзначыць, што шмат якія рабочыя і чырвонаармейцы з вялікім энтузіязмам і не шкадуючы сябе, дзень і ноч, не складаючы рук гэраічна змагаліся са стыхіяй. І вынікам гэтай адданай работы было тое, што цэлы рад прадпрыемстваў ахаваны ад паводкі (кушнярная фабрыка, „Камунар", завод імя Варашылава і інш.).

Зараз можна з упэўненасьцю канстатаваць, што асноўная небясьпека веснавога разьліву ўжо мінула. Цяпер усе сілы неабходна накіраваць на максымальна-тэрміновую ліквідацыю вынікаў паводкі.

Па-першае, неабходна пусьціць электрастанцыю. Сёньня на Эльводзе працуе ўвесь калектыў рабочых, якія выпампоўваюць ваду з машыннага аддзяленьня і прыводзяць у парадак абсталяваньне. Мы мяркуем, што сёньня ноччу Эльвод будзе пушчан. Іншыя прадпрыемствы павінны таксама мабілізаваць сваю рабочую грамадкасьць на прывядзеньне ў парадак фабрык і заводаў і ліквідацыю прарываў, якія ўзьніклі ў выніку паводкі.

Для забесьпячэньня насельніцтва затопленых раёнаў часовым жыльлём мы мабілізавалі школы, клюбы і інш. памяшканьні. Цяпер перад намі, перад кожным працоўным стаіць важнейшая задача: на працягу бліжэйшых некалькіх дзён аднавіць разбураныя будынкі.

Гарсавет даручыў камунаддзелу, Менбуду і Гаржылсаюзу кінуць на гэтую справу ўсе маючыяся рэзэрвы рабочых і будаўнічых матар'ялаў. Але неабходна памятаць, што Гарсавет адзін, сваімі сіламі ня здолее справіцца з гэтымі задачамі. Неабходна мабілізаваць усю рабочую і савецкую грамадзкасьць на аднаўленьне памяшканьняў і прадпрыемстваў.

Ня менш важнай задачай зьяўляецца ўстанаўленьне страт ад паводкі. Пакуль у нас яшчэ няма дакладных вестак але паводле арыентоўных даных страты дасягаюць $2_1/_2$—3 млн. руб.

У заключэньне неабходна адзначыць, што ў зьвязку з паводкай у горадзе разьнесьліся контр-рэвалюцыйныя чуткі, якія распаўсюджваюцца клясавым ворагам, аб тым, што мы маем вялізарную колькасьць ахвяр. Гэтыя чуткі ні ў якім разе не адпавядаюць сапраўднасьці. На сёньнішні дзень мы маем весткі аб тым, што ўтапілася толькі 3 чалавекі і то тыя, якія не жадалі выехаць з кватэр.

Я ўпэўнен у тым, што пры дапамозе і энэргічнай рабоце ўсёй пралетарскай грамадкасьці мы ў бліжэйшы час ліквідуем вынікі паводкі і прарывы на прадпрыемствах.

С. Г.

ТДА-Авіахімаўцы на барацьбу з паводкаю

Паводка ў Менску і іншых раёнах БССР набыла пагражаючыя разьмеры. Бушуючая стыхія затапіла шмат кварталаў. Паралізавала жыцьцёвую артэрыю гораду, сьвятло і ваду, заставіла бяз прытулку многія сем'і і працягвае сваю справу.

ТДА-Авіяхім апора мірнай працы ня можа быць пасыўным у справе дапамогі насельніцтву і павінен усімі існуючымі сіламі і сродкамі змагацца з паводкаю.

Ва ўсіх кампаніях ТДА-Авіяхімаўцы былі наперадзе. І зараз яны павінны выйсьці на барацьбу з паводкаю ў авангардзе.

Тэрмінова зьвязацца з тройкаю на барацьбе з паводкаю, мабілізаваць арганізаваныя атрады і каманды, а таксама ўневайскавікоў на барацьбу з паводкаю і на дапамогу пацярпеўшым.

Усе як адзін авіяхімаўцы наперад, на справу барацьбы з паводкаю і на дапамогу пацярпеўшым ад яе.

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету ТДА-Авіяхім БССР

22 красавіка 1931 г.
г. Менск.

Інфармацыйная зводка

галоўнага кіраўніцтва міліцыі і Крымвышуку БССР аб паводцы па БССР.

Бабруйскі раён. 24—IV—9 гадз.

Лёд на рацэ Бярэзіне рушыўся. Вада прыбывае. На ўсходнім баку г. Бабруйску дамы затоплены вадой. Чалавечых ахвяр няма. Рагачоўская шаша заліта вадой. Зносіны з Рагачовам спынены. Прымаюцца меры да перасяленьня насельніцтва ў месцы, якім не пагражае паводка.

Барысаўскі раён 24—IV—20 г. 30 хв.

На рацэ Лаханцы вадой размыта грэбля, зносіны спынены.

На рацэ Бярэзіне ля в. Чэрніна паводкай знесена грэбля на працягу паўтара кілёмэтры. У в. Чарняўку высланы кацер з камандай міліцыянэраў і чырвонаармейцаў.

У гор. Барысаве зьнесена 10 дамоў. У горадзе ля маста вада на ўзроўні грэблі. Грэбля паднята на 1/3 мэтра. Каля мастоў заўважаецца накапленьне лёду. Вайсковымі часьцямі прымаюцца меры да аслабаненьня лёду ля мастоў.

Са складу Бярэзінскай веткі, якому пагражала затапленьне, паднята 160 тон аўса, 6 вагонаў солі. Для гэтай мэты ў парадку працпавіннасьці было прыцягнута каля 200 чал. насельніцтва.

Дубровенскі раён 24-IV, 19 гадз.

У раёне ад напору вады сарваны млыны. Склады ўмацаваны

Гомельскі раён 24-IV, 7 г. 55 хв.

Здарэньняў у сувязі з паводкаў няма.

Чавускі раён 24-IV, 6г. 10 хв.

Паводка на раёне набыла нябывалы разьмер.

Аршанскі раён 24-IV, 12 г. 50 хв.

Пад'ём вады дасягае 10 мэтраў. Затоплена каля 200 дамоў. Аршанскія масты затоплены. Лёдаход ня скончыўся; уздым вады чакаецца большы.

Магілёўскі раён 23-IV, 13 г. 45 хв

У Магілёве—Дняпро з берагоў вышаў. Дамы на акраінах затапляюцца.

Віцебскі раён 24-IV, 12 г. 20 хв.

На рацэ Гаранаўцы зьнесены млын. Пачало затапляць гарбарню, лесазавод, камбінат. Узровень вады ў Віцебску 23 красавіка, а 8 і 10 гадзіне 8,95, сёньня а 10 гадзіне атрыманы весткі аб суцэльным ледаходзе.

Дубровенскі р. 24-IV, 23 г. 50 хв.

На Дняпры ўзровень вады павялічваецца. Затоплена 159 дамоў.

Сураскі раён 24-IV, 12 20 хв.

Вада паднялася 9 мэтраў.

Па Менску

Паводле вестак Адмаддзелу становішча паводкі ў Менску на 5 гадзін раніцы 24/IV—не пагражаючае. Вада ўвайшла ў берагі.

Высьвятляецца, што наступныя прадпрыемствы маюць страты ў выніку паводкі: завод „Пралетары", млын „Чырвоны сьцяг" мэханізаваныя майстэрні Меншвэю, завод „Камунар", садаводэтва, млын імя Дзяржынскага, млын „Чырвоны аўсянік", арцель „Чырвоны мэталіст", крама МЦРК № 83 і інш.

Бязумоўна гэтыя весткі ня поўныя. У сапраўднасьці страты значна большыя. Высьвятленьне страт працягваецца.

Барацьба яшчэ ня скончана

Сьвіслач разьлілася нечакана-хутка. У ціхай плыні гэтай напалову высахлай ракі таілася небясьпека.

З раніцы (21 красавіка) вада моцнымі, мутнымі струменямі, рэзкімі штуршкамі вышла з берагоў і заліла прылеглыя вуліцы.

Вада паднялася да 4 мэтраў. Разводзьдзя такой сілы ня памятае Сьвіслач. Вучоныя-мэтэарыолагі адзначаюць паводку такога-ж разьмеру ў Беларусі толькі ў 1845 годзе.

Сёлета можна было чакаць вялікай паводкі, але такія разьмеры, да якіх яна дайшла, цяжка было прадбачыць.

... Увечары вада зьявілася ў машынным аддзяленьні Эльводу. Помпы не пасьпявалі пампаваць яе, і каля 2 гадзін уначы Эльвод выключае сьвятло, спыняючы работу фабрыкі і заводы, якія жывіліся токам Эльводу...

... Тэлеграф даносіць весткі аб тым, што паводка парушыла нармальны рух па чыгунцы, што паштовы цягнік на масту прымушаны быў вярнуцца назад. Стварыўся прарыў паміж станцыямі Смалявічы і Жодзіна.

Раніцою выйшаў толькі адзін нумар экстранага выпуску газэты „Зьвязда".

Унечарговае паседжаньне Менскага гарсавету пастанавіле: пашырыць склад камісіі па барацьбе з паводкай, выносіць цэлы рад канкрэтных дырэктыў-пастаноў, якія гучаць кароткімі лёканічнымі загадамі:

— Пад асабістую адказнасьць таварышу...

— Праз дзьве гадзіны праверыць выкананьне!

У гарсавеце ў старшыні камісіі круглыя суткі напружана працуюць людзі. Тэлефон № 54 ня ведае адпачынку. Камісія па барацьбе з паводкай робіць паседжаньні па некалькі разоў у дзень, праверае кожную дробязь, кожнае распараджэньне.

СНК БССР стварае рэспубліканскія камісіі па барацьбе з паводкай.

* * *

Клясава-варожыя элемэнты засіпелі па кутох, перадавалі „сьвежыя навіны" з асаблівым смакам.

— Я сама бачы а, як плыў дом, а ў доме палілася электрычнасьць!..

— А вось па Саловай, у кошыку плаваў чалавек і іраваў лапатай.

— Наконт хлеба не хвалюйцеся два тыдні, зразумелая рэч, яго ня будзе.

Кожная падзея пераўвялічаная і аздобленая „праўдзівымі" фактамі „відавочнікаў" плыла па горадзе. Клясавы вораг і тут знайшоў шчыліны для таго, каб працягнуць сваю дзейнасьць супроць краіны будуючай сацыялізм.

... Гультаі, прагульшчыкі скарыстаўшы часовае спыненьне руху паміж аднэй і другой часткаю гораду, ня выходзілі на работу нават тады, калі магчымасьць была.

Каапэрацыйныя грызуны спрабуюць перавялічыць страты і гэтым самым пакрыць свае злоўжываньні.

А гэраічнымі памаганьнямі рабочых заводу „Дрэваапрацоўшчык" быў даданы ток хлебазаводу і цэнтральнай частцы гораду. Пажарныя каманды забясьпечвалі больніцы, сталоўкі, дзіцячыя ўстановы вадой.

... Лепшыя ўдарнікі камуністы і камсамольцы заводу імя Варашылава гэраічна абараняюць Аранскі мост якому пагражае небясьпека быць змыты.

Камунарцы ўсю ноч абаранялі Першамайскі мост.

— Такім чынам, ніякіх падстаў да панічных настрояў не павінна быць!—заклікае „Зьвязда".

— Усе, хто займаецца распаўсюджваньнем панічных чутак аб магчымасьці перабояў у забясьпечаньні павінна разглядацца як контррэвалюцыйныя элемэнты і прыцягвацца да адказнасьці!

Камісія па барацьбе з паводкай мела ў сваім распараджэньні 17 лодак. Гэтым „флётам" камісія парашула весьці барацьбу з паводкай. Калі-б не дапамога гарнізону і вайсковых часьцей, калі-б не сапёрныя лодкі і понтоны, калі-б не гэраічная работа чырвонаармейскіх часьцей, вынікі страт ад паводкі павялічыліся-б у некалькі разоў.

Аб дысцыплінаванай, дружнай і энэргічнай рабоце чырвонаармейскіх часьцей можна расказаць шмат цікавых эпізодаў. Адзін толькі атрад бронядывізіону выратаваў з затопленых дамоў 55 чалавек.

Спакой і хуткасьць, з якой працавалі, могуць паслужыць прыкладам для цэлага раду іншых арганізацый, якія ў часе паводкі літаральным чынам зьбянтэжы ся...

У Доме асьветы, у пэдтэхнікуме, у клюбах гораду Менску разьмешчаны пацярпеўшыя ад паводкі. МЦРК арганізаваў дастаўку абедаў і прадуктаў пацярпеўшым.

* * *

Вада ўвайшла ў берагі.

Але барацьба з паводкай яшчэ ня скончана. Неабходна самая энэргічная і арганізаваная барацьба з вынікамі паводкі. Зусім законна і зразумела трывога, якая выклікаецца вынікамі паводкі. Страты ад паводкі вылічваюцца буйнымі сумамі.

Некаторыя прадпрыемствы спынілі работу. Прарывы ў выкананьні прачфінпляну, у выкананьні пляну т. зняга рашаючага году пяцігодкі будуць адчувацца. З такім-жа гэраічным энтузіязмам, з якім ударнікі-рабочыя ратавалі свае заводы ад небясьпекі паводкі, з такой-жа сілай і хуткасьцю трэба ліквідаваць вынікі паводкі.

Для каапэрацыі чоткая барацьба з вынікамі паводкі, бесьперабойнае забясьпечаньне насельніцтва ньяўляецца баявым экзаменам. Каапэрацыя павінна давесьці, што яна здольна працаваць у баявых абставінах.

Тэлеграф прыносіць весткі аб тым, што ў часе паводкі па ракам Беларусі зносяцца каштоўнейшы лясны матар'ял. Захаваць заг тоўлены лес, умацаваць сплаўныя прыстані, не дапусьціць, каб паводка зноўла каштоўнейшую драўніну—вось задача сплаўных арганізацый.

На барацьбу з вынікамі паводкі павінны быць мабілізаваны шырокія масы працоўнага насельніцтва.

Барацьба з паводкай ня скончана, яе трэба працягваць з неаслабнай сілай, з нязвычайнай хуткасьцю бальшавіцкай энэргіяй.

Б. Б.

Скураная прамысловасьць БССР выканала пяцігодку

Толькі правільнае кіраўніцтва ленінскай партыі, шырока разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва далі магчымасьць рабочым скурана-абутковай прамысловасьці дабіцца такой перамогі

ЦК КП(б)Б, ЦВК БССР, ЦСПСБ, ВСНГБ

Рапарт Беларускага скуранога аб'яднаньня і Цэнтральнага праўленьня саюзу гарбароў

Да дню другой гадавіны ленінскага спаборніцтва, да дню міжнароднага пралетарскага першага мая дзяржаўная скураная прамысловасьць Савецкай Беларусі рапартуе партыі і ўраду аб новай бліскучай перамозе, атрыманай на вытворчым фронце.

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву ленінскай камуністычнай партыі, дзякуючы не замірнай барацьбы з правымі „прарокамі" і „левакамі", якія лямантавалі аб непасільнасьці ўзятых тэмпаў, дзяржаўная скураная прамысловасьць БССР дамаглася выкананьня ў два з паловай гады свайго пяцігадовага пляну.

Гэта перамога зрабілася магчымай у выніку самаадданай работы рабочых скуранай і абутковай прамысловасьці, гэты высокі тэмп барацьбы за бальшавіцкую пяцігодку зрабіўся магчымым дзякуючы шырока разгорнутаму сацыялістычнаму спаборніцтву і ўдарніцтву.

Мы дамагліся наступных вынікаў работы:

Паводле пляну, у канцы сваёй пяцігодкі скурапрамысловасьць Беларусі павінна была выпусьціць штодня 1.185 буйных скур, цяпер мы ўжо выпускаем 1.550 скур. Паводле пляну мы павінны былі выпускаць у канцы пяцігодкі штодня 5.267 дробных скур, выпускаем цяпер 5.151 штук. Абутку мы выпускаем 8.796 пар штогод, замест прадугледжаных плянам у канцы пяцігодкі 8.069 пар.

Валавая прадукцыя ў канцы пяцігодкі павінна была выразіцца ў суме 49.600.000 рублёў. Наша праграма на 1931 г. прадугледжвае выпуск прадукцыі на 54.411.000 рублёў.

Сярэдні заработак на аднаго чалавека павінен быў складаць у першым квартале 1932-33 г. 101 р. 60 кап., фактычна ён складае ў першым квартале гэтага году 101 р. 53 кап.

Паводле пяцігадовага пляну па скураной прамысловасьці павінна было быць занята 4.003 рабочых у канцы пяцігодкі, у сапраўднасьці-ж колькасьць рабочых, занятых у скураной прамысловасьці, налічвае на сёньняшні дзень 4.954 чалавек.

Капітальныя затраты на ўсю пяцігодку былі намечаны ў суме 10.458.000 руб. На 1 мая, выканаўшы намёткі пяцігодкі, мы затрацілі на капітальнае будаўніцтва толькі 7.103.000 руб. Ўвоз імпортнага абсталяваньня па скураной прамысловасьці быў прадугледжаны плянам у суме 708.000 р., фактычна затрачаная сума імпортнага абсталяваньня складае ўсяго толькі 220.000 руб.

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву камуністычнай партыі і яе рашучай барацьбы з усімі ўхіламі ад генэральнай лініі, скураная прамысловасьць БССР намячае на 1932 г. выпуск прадукцыі на суму 93.890.000 руб., што складае павялічэньне за адзін год амаль у два разы ў параўнаньні з намёткамі пяцігадовага пляну.

Рапартуючы аб сваіх дасягненьнях, рабочыя скуранай прамысловасьці БССР заяўляюць, што яны ў далейшым будуць ісьці па шляху, паказаным Леніным, і кожнай сваёй перамагай на сацыялістычным фронце будуць наносіць новыя зьнішчальныя ўдары капіталізму.

Няхай жыве камуністычная партыя—кіраўнік рабочае клясы і яе праводыр тав. Сталін!

Белскураб'яднаньне
ЦП Саюзу гарбароў.

На барацьбу з паводкай!

Па тэхнічных прычынах

газэта ЧАСОВА выходзіць ВЯЧЭРНІМ ВЫПУСКАМ

Разгарнуць масавы сплаў

Лесбел не падрыхтаван да сплаву. Белкаапсаюз не забясьпечвае сплаўныя пункты прадуктамі і прамтаварамі

Толькі выразная, арганізаваная і ўдарная работа на сплаве зможа забясьпечыць бальшавіцкае выкананьне сплаўнай праграмы трэцяга рашаючага

На сплаўным фронце

Зводка тэлефонных і тэлеграфных данясеньняў аб стане вясеньняга разводзьдзя, паводак і захаваньня драўніны

— **Чэрвень** — леспрамгас. На раце Волме спакойна. Узьняцьце вады спынілася. Прыстані ўмацаваны. Паводка не пагражае.

— **Рака Вуша.** Сарваныя 3000 куба-мэтраў драўніны 21 і 22 красавіка затрыманы і ўмацаваны на мясцох. Вада спадае. Млыновыя грэблі і спускі размыла.

— **Рака Вуса.** Зьнесла млыны Пруд і Новая Ніва. Прыстані з лесам утрыманы. Моцны падпор вады з Бярэзіны. Вярхоўе—прыкметнае паданьне вады.

— **Рака Гаць.** Прыстаням не пагражае паводка. Прыстані не ўмацаваны. (Інфарм. т. Хоміча).

— **Барысаў.** Вада прыбывае. Да 2-х гадзін дню з раніцы на Бярэзіне ўзьнялася вада на 7 сантымэтраў. Заводы „Камінтэрн" і Леніна спынены. На раце Сха ля вярхоўя вада пачынае спадаць. Прыстані на месцы і ўмацаваны. На возеры Палік яшчэ стаіць лёд. Мінулагодні лес, які знаходзіцца вышэй Весялова, умацаваны. Усе прыстані на Бярэзіне на месцы. Катэр „Вперед" вышаў у Чарняўку. Вада набліжаецца да шашы, хутка перакінецца праз шашу. (Інфармацыя т. Лубнеўскага).

— **Бярэзінскі леспрамгас** м. Бярэзіна. Рака Брусята. Лесаматар'ялы на прыстані Міхеевічы расплыліся. Прыняты меры да затрыманьня іх. На прыстані Рудня мост на месцы.

— **Рака Можа.** Прыстань Ухвалы расплылася, 4-5 ярусаў. Матар'ялы ўтрымліваюцца. Мост на месцы. Вада ўзьнялася на 32 сантымэтры.

— **Рака Клява.** Прыстані ўмацаваны, усё ў парадку.

— **Рака Вуша.** Прыстань Багушэвічы—сарвана 100 куб.-мэтр. лесаматар'ялу ў Гленях, Чэрвеньскага леспрамгасу. Прыняты меры да затрыманьня яго. Астатнія прыстані ў парадку. Вада спадае.

— **Рака Бярэзіна.** З 12 г. ўночы да 12 г. дню вада прыбыла на 98 сантымэтраў. Прыстані ў парадку. (Інфармацыя т. Шульга).

— **Бабруйская сплаўная кантора.** На раце Бярэзіне ў Пішчына сарвана 6 пасаў мінулагоднія вязкі. Выслана арцель для ўстаноўкі гэтых пасаў. Спадзяемся ўстанавіць ніжэй. На р. Сьвіслачы спакойна. Прыстані і мінулагодні лес утрымліваюцца. На раце Ольсе ўсе прыстані падняты, але ўмацаваны. Вада ўзьнімаецца на Сьвіслачы, Бары і Ольсе. Драўніна ўтрымліваецца. Вылучаны арцелі для затрыманьня паплыўшага лесу. У рабоце прымаюць ўдзел сельсаветы. (інф. т. Паперна).

— **Нёманскі леспрамгас.** На раце Узьдзянка, Лоша, Нёман, Вуса вада зьніжаецца. Прыстані ўмацаваны. Пагрозы няма. (Інф. тав. Шуба).

— **Копысь.** Вучлеспрамгас. Ходам лёду пашкоджаны частка прыстанёў. Ёсьць выпадкі расплаву лесу. Меры да захаваньня драўніны прымаюцца. Мабілізавана 100 чал. Тэлеграма старшыні райвыканкому.

Рачыцкі леспрамгас. На раце Ведрыч вада спала на 2 вяршкі. На раце Сьведзь бяз зьмен, прыкметны нязначны спад вады. Па Дняпру вялікі ўздым вады. На Бярэзіне таксама. На прыстанёх па Дняпру ёсьць выпадкі часткі пашкоджаньня прыстаняй. Меры да ўмацаваньня прымаюцца. (паведамл. Рэчыцк. леспрагасу, Гомельскай спл. к-ры і т. Усхопава).

Рака Прыпяць. Тэлефоннай сувязі з Мозырам няма. Па тэлеграфным паведамленьні сплаў на выплавачных рэках і каналах пачаўся. На 20-е красавіка пушчана ў сплаў 36.700 куба-мэтраў. Здана на прыстанёх Украінлесу і іншых організацыях 70.437 куб. мэт. Патрабавалася рабочых—4202 чал. мясцовых, прывозных,—520 чал. У сярэднім у дэкады дзень працавала мясцовых—4200, прывозных—300 чал. За апошні дзень мясцовых працавала 3202 чал., прывозных—520 чал. Паводле чутак вада на Прыпяці ўзьнімаецца.

Заходняя Дзьвіна. Тэлефоннай сувязі з Віцескам няма. Атрымана тэлеграма з Полацкага леспрамгасу—уздым вады нябывалы. Румы ўмацаваны. Вызначана кругласутачнае дзяжурства. У выпадку неабходнасьці будзе мабілізавана насельніцтва.

Зводка складзена 23-IV а 5 гадз. увечары.

Казіміровіч.

Да сплаву Лесбел дрэнна падрыхтаваны

Калі ў мінулым годзе лясная і дрэваапрацоўчая прамысловасьці давала 180 млн. руб. прыбытку, дык у гэтым годзе павінна складаць 240 млн. руб. Выкананьне плянаў лясной гаспадаркі—адно з важнейшых мерапрыемстваў сьяховага выкананьня трэцяга, рашаючага году пяцігодкі.

Як-жа Лесбел выконвае свой прамфінплян па сплаву? Да сплаву трэба было падвезьці 5 млн. 396 тыс. куба-мэтраў, а ўсяго падвезена 2 млн. 101 тыс. кубамэтраў, што складае 40 проц. да пляну.

Веснавая навігацыя, якая зараз пачалася, патрабуе ўдарных тэмпаў у рабоце Лесбелу. Які мы зараз маем малюнак работы па лініі Лесбелу?

Колькасьць загатоўленай гужбы ні ў якім разе ня можа задаволіць патрэбу сплаўных пунктаў.

Так, па пляну павінна быць загатоўлена 15 млн. штук гужбы, а загатоўлена 6 млн. штук, што складае 40 проц.

Па радзе леспрамгасаў зроблена мала лодак, дубоў, снасьцей.

Вярбоўка рабочай сілы праходзіць марудна. Так, павінна быць завербавана лесасплаўшчыкаў у веснавую навігацыю 1931 г 29 тыс. чалавек, а завербавана 18 тыс.

Па Бабруйскім і Мазырскім леспрамгасах толькі завербавана 50 проц. рабочай сілы. Слабая вярбоўка рабочай сілы тлумачыцца тым, што ў гэтым годзе Лесбел загатоўвае для сплаўшчыкаў боты, але гэтыя боты зусім ня годныя для сплаву. Патрэба ў ботах складае 36 тыс. пар, занаряжана 14 тыс, а паступіла—11 тыс. пар ботаў. Усе гэтыя боты з кароткімі халявамі і зусім ня могуць адпавядаць умовам лесасплаўных работ.

Забясьпечэньне няпрыдатнымі ботамі лесасплаўшчыкаў ёсьць нішто іншае, як шкодніцтва. Гэтым фактам павінны зацікавіцца адпаведныя органы.

Лесбел тлумачыць гэта тым, што Белкустпрамсаюзу быў дан нарад на пашыўку ботаў з доўгімі халявамі, а Белкустпрамсаюз загатовіў в кароткімі. Вось і разумей, хто з іх правы, а хто вінаваты.

Белдзяржснаб толькі зараз прыступіў да завозкі прамтавараў на лесасплаўныя пункты. Па радзе леспрамгасаў з боку раённых каапсаюзаў няма зацікаўленасьці ў забясьпячэньні прадуктамі харчаваньня рабочых сплава.

Расонскі і Ўшачэўскі райкаапсаюзы прапануюць лесасплаўшчыкам замест мукі браць жытам.

Па пляну Лесбелу на ўвесь час веснавой навігацыі павінна быць адкрыта 17 сталовак і гарантыю для рабочых сплаўшчыкаў, а ўсяго толькі адкрыта 4 сталоўкі. У такім буйным пункце, як Дрыса, праз які ідзе экспартны лес, сталоўка не адкрыта, а адкрыты сталоўкі толькі на аднэй рэчцы—Бярэзіне (у г. Бабруйску і Барысаве), а на такой буйной рэчцы, як Дняпро, іх зусім няма.

Лесбел не загатовіў адпаведную колькасьць катлоў і паходных кухань для сплаўных арцеляй.

Па лініі культурна-масавага абслугоўваньня лесасплаўшчыкаў Лесбел толькі складае свае плянавыя меркаваньні, а практычна нічога ня робіць. Лесбел не падрыхтаваў належных тэхнічных кадраў, чаму зараз па радзе сплаўных вучасткаў адчуваецца недахват у іх.

Большасьць адказяленьняў Лесбелу не перайшлі на фінансавы разьлік, што ў значнай меры зьяўляецца тормазам у правядзімай рабоце.

Такая падрыхтоўка Лесбелу да сплаўной навігацыі зьяўляецца слабой і патрабуе тэрміновай ліквідацыі маючыхся прарываў.

На самых лесасплаўных работах патрэбна паставіць пытаньне аб шырокім разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва, арганізаваць ударныя брыгады і датэрмінова выканаць плян сплаву гэтага году.

Ударная брыгада „Сав. Бел." А. Ларычкоў, З. Мазюк.

Белкаапсаюз не павярнуўся тварам да сплаву

Пагледзім як некаторыя зацікаўленыя арганізацыі ўдзельнічаюць у такой важнай гаспадарча-палітычнай кампаніі як сплаў? Пагледзім, ці павярнуліся яны тварам да сплаву?

Гомельская сплаўная кантора атрымлівае трывожныя весткі з Касьцюковіцкага сплаўнага вучастку аб тым, што ў райсаюзе ня маецца яшчэ фондаў забясьпечаньня прадуктамі і прамтаварамі для сплаву!

Выехаўшая брыгада ад Гомельскай сплаўной канторы нічога канкрэтнага не магла дабіцца ў Касьцюковіцкім райсаюзе. Аказалася, што ў Хоцімскім і Касьцюковіцкім райсаюзах няма нават нарадаў па прамтавары і прадукты. Прышлося паехаць на базу Белкаапсаюзу, якая адгрузіць гэтыя прадукты.

На базе высьветлілася, што ў гэтыя райсаюзы ня былі нават вызначаны нарады.

Усё гэта гаворыць аб тым, што Белкаапсаюз не павярнуўся тварам да сплаву, што забясьпечаньне сплаўных пунктаў прадуктамі і прамтаварамі знаходзіцца ў вельмі дрэнным становішчы.

Брыгадзір „Сав. Бел." Гершман.

25 красавіка—кантрольны тэрмін выкананьня пляну адгрузкі бульбы

Загатоўчыя арганізацыі ганебна зрываюць сацумову з Заходняй вобласьцю па сваячасовай адгрузцы бульбы

Бульба павінна быць адгружана

Радыёграма райкомам комсамолу

Ворша, Горкі, Дрыбін, Расна, Чавусы, Шклоў, Копысь, Коханава, Круглае, Сянно, Крупкі, Халопенічы, Лепель, Вула, Ветрына, Смалявічы, Лагойск, Бялынічы, Клічаў Чачэвічы, Ст. Быхаў, Ст. Дарогі, Слуцак, Грэск, Старобін, Тураў, Петрыкаў, Капаткевічы, Ельск, Нароўля, Хойнікі, Юравічы, Брагін, Мазыр, Парычы, Жлобін, Рагачоў, Прапойск, Журавічы, Буда-Кашалёва, Уваравічы, Рэчыца, Ветка, Чачэрск, Касьцюковічы, Дуброўна.

Надаючы выключна палітычнае значэньне загатоўцы і адгрузцы насеннай бульбы Ленінграду, Украіне і Маскве, Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ прапануе прыняць тэрміновыя захады для актыўнага ўдзелу ў сваячасовым выкананьні дадзеных раёнам кантрольных заданьняў, мабілізаваўшы ўсю камсамольскую арганізацыю на правядзеньне гэтай справы.

ЦК абавязвае і даручае правядзеньне ўсёй работы па выкананьні пляну адгрузкі бульбы бюро РК комсамолу і брыгадзе ЦК ЛКСМБ якія працуюць на пасеўкампаніі. Згодна пастановы ЦК КП(б)Б і Савнаркому БССР, адгрузка павінна быць скончана 25 га красавіка.

Аб прынятых захадах і ходзе адгрузкі інфармуйце ЦК.

Заг. арг. інструк. аддз. ЦЕЛКСМБ **Пацукоў.**

Зводка

адгрузкі бульбы за 20, 21 і 22 красавіка

Паводле вестак Белсадгароднины, за апошніх тры дні насеннай бульбы для Украіны адгружана Белкаапсаюзам 122 тоны і Беллёнасаюзам 107 тон; для Ленінградзкай вобласьці адгружана Белкаапсаюзам 58 тон і Беллёнсаюзам—30,3 тон. Усяго насеннай бульбы адгружана за тры дні 317,3 тон, што складае разам з папярэдняй адгрузкай 629,5 тон, або 2,9 проц. пляну.

За гэты-ж час адгружана сталовай бульбы для прамысловых цэнтраў 572,2 тоны, з якіх Белкаапсаюзам—441,2 тоны і Беллёнасаюзам—131 тона. Разам з папярэдняй адгрузкай сталовай бульбы адгружана 2190,1 тон або 5,4 проц. пляну.

Агульнае выкананьне пляну адгрузкі насеннай і сталовай бульбы дасягнула на ўчарайшы дзень толькі 4,5 проц. заданьня, а між тым заўтра — 25 красавіка канчаецца контрольны тэрмін выкананьня пляну бульбазагатовак.

Цэнтральныя загатоўчыя організацыі не адказалі ні на першае ні на паўторнае запытаньне газэты „Савецкая Беларусь" аб тым, што імі зроблена для забясьпячэньня сваячасовай адгрузкі бульбы. Ужо цяпер можна сказаць, што яны ганебна сарвалі выкананьне пляну адгрузкі бульбы, сарвалі выкананьне дагавору сацспаборніцтва з Заходняй вобласьцю на лепшае і сваячасовае выкананьне пляну адгрузкі насеннай бульбы.

Канкрэтныя віноўнікі зрыву павінны быць выяўлены.

Усім РВК, райспажыўсаюзам, райкаапсаюзам

Папераджаем, што паводка і бездарожжа ні ў якім разе ня зьнімаюць адказнасьці з раённых арганізацый за выкананьне загатовак і вывазу бульбы.

Пастанова СНК аб ударным выкананьні адгрузкі бульбы Маскве і ЛВО, а таксама насеннай бульбы Ленінградзкай вобласьці і Украіне павінна быць выканана поўнасьцю і ў тэрмін. У крайніх выпадках немагчымасьці дастаўкі і адгрузкі бульбы, прымеце захады да разгортваньня работы загатовак унутры раёнаў, забясьпечыўшы 100 проц. выкананьне пляну закантрактаванай бульбы ў калгасах і паселішчах пад сахранныя расьпіскі з абавязковай дастаўкай бульбы пасьля разьліву на станцыі чыгунак і прыстаняў.

Аб ходзе загатовак і адгрузкі тэлеграфуйце.

Наркамснаб **Балцін**
Белкаапсаюз **Хаскін**
Беллёнсаюз **Лаціс**

Да адказнасьці за зрыўшчыкаў

На апошнім паседжаньні штабу па бульбазагатоўках пры Наркамснабе адзначана, што вучот бульбазагатовак і кантрактацыя па лініі Белкаапсаюзу настаўлены надрэнна, а Койданаўскі, Сьмалявіцкі, Вузьдзенскі і Чэрвеньскі раёны, прымацаваныя для адгрузкі бульбы Менску, не разгарнулі адгрузкі зусім.

Пастаноўлена перадаць пракурору справу аб Касьцюковіцкім, Вушацкім і Хойніцкім РВК, якія забаранілі вывав бульбы з раёну.

Пост газ. „Сав. Бел." у Белсагароднине **Прэабражэнскі, А** сенчык, **Генін.**

У бульбазагатоўках няма пералому

Белсадгароднина атрымлівае штодзень трывожныя весткі з месц аб тым, што шмат раёнаў не пачалі адгрузкі бульбы з БССР.

Петрыкаў, Нароўля, Калаткевічы сваячасова не разгарнулі работы. Загатовкі Нараўлянскі райснаб тэлеграфуе, што ў зьвязку з паводкай нельга будзе бульбу даставіць на станцыю. Дзе вы былі раней, таварышы з Нароўлі? Няўжо вам неядома было, што раён павінна разьліцца?

Старадарожскі і Касьцюковіцкі РВК знайшлі такі мэтад апрэўданьня сваёй апартуністычнай практыкі: яны склалі раённыя „балянсы" бульбы, па як веснавы вываз перавысіў „таварнасць" раёну па бульбе. Дзе тут гаварыць аб выкананьні дырэктыў па вывазе бульбы з БССР?

Справа патрабуе рашучага пералому ў ходзе адгрузак бульбы з БССР.

Пост газ. „Савецкая Беларусь" у Белсадгароднине, Прэабражэнскі, Аксенчык Генін.

Беллёнасаюз прыняў выклік калектыву Белсадгароднины

Калектыў Беллёнасаюзу прыняў выклік калектыву Белсадгароднины абавязаўшыся ударнымі тэмпамі ўзяцца за работу па загатоўках і адгрузках бульбы.

Пажадаем Беллёнасаюзу гэта абавязацельства пацьвердзіць справай—цалкам адгрузіць бульбу прамысловым цэнтрам Саюзу.

Пост-брыгадзір газ. „Сав. Бел." **Прэабражэнскі.**

Забылі пра кулака

апартуністы з Чашніцкага РВК

Моцна ўдарыць па апартуністых, якія зрываюць фінплян. З усёй рашучасьцю ўзяцца за мабілізацыю сродкаў насельніцтва

За кантроль рублём!

Гаспадарчы разрахунак ёсьць важнейшы рычаг кіраўніцтва гаспадарчымі арганізацыямі, магутны рычаг у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Да гэтага часу для кіраўнікоў гаспадарчых органаў накапленьні былі нічым іншым як маральным абавязкам, пазбаўленым сапраўднага кантролю над выкананьнем фінансавай дысцыпліны. Некаторыя гаспадарнікі лічылі, што навошта клапаціцца аб рацыяналізацыі, зьніжэньні сабекошту, аб мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і прыбытках, калі гэтыя прарывы можа пакрыць і вынесьці на сваіх плячох Дзяржбанк.

СНК СССР 20 сакавіка гг. выдаў пастанову аб новым крэдытаваньні, аб пераводзе ўсіх прадпрыёмстваў і устаноў на гаспадарчы разрахунак—пад кантроль рублём.

Такім чынам рашэньні партыі і ўраду заменьваюць усю сыстэму крэдытаваньня. У аснову крэдытаваньня ставіцца пытаньне жорсткага гаспадарчага разьліку, праверкі выкананьня ўсіх нашых гаспадарчых плянаў рублём. Замест агульнага крэдытаваньня „пад плян" устанаўляецца адзіная агульная сыстэма крэдытаваньня рэальных гаспадарчых зьдзелак.

З 1 мая павінна быць поўнасьцю ажыцьцёўлена гэта важнейшая дырэктыва партыі і ўраду, усе прадпрыёмствы і ўстановы павінны перайсьці на новы парадак крэдытаваньня, які ўстаноўлены СНК СССР ад 20 сакавіка гг.

У сучасны момант асяродкам увагі павінна стаць праходзячая кампанія па заключэньні дагавораў, ахапляючых дастаўку тавараў, вытворчасьць працы і аказаньне паслуг у межах прадугледжаных плянам. У гэтых дагаворах павінна быць абавязкова агаворана матар'яльная адказнасьць і няўстойка за выкананьне дагавораў.

Трэба цьвёрда памятаць, што тыя прадпрыёмствы і ўстановы, якія не заключаць дагавары ў тэрмін, апынуцца ў надзвычайна цяжкім становішчы, бо яны будуць пазбаўлены крэдытаваньня, забясьпечваючага выкананьне пляну.

Разам з гэтым неабходна зараз-жа зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на пастаноўку фінансава рахунковай справы на прадпрыемствах, на ўмацаваньне фінансава-рахунковых галін адпаведнымі працаўнікамі.

Партыя і ўрад патрабуюць ад усіх арганізацый выключнай увагі да справы падрыхтоўчай работы, усебаковага кантролю, сваечасовага і поўнага інструктаваньня прадпрыемстваў і ўстаноў па заключэньні дагавораў.

Правільнае і хуткае правядзеньне ў жыцьцё дырэктывы ўраду ад 20 сакавіка зьяўляецца адным з важнейшых фактараў, якія забясьпечваюць выкананьне народна-гаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Да 1 мая засталіся лічаныя дні. Заключэньне дагавораў, усю падрыхтоўку да ўвядзеньня новай сыстэмы крэдытаваньня трэба паставіць па сапраўды бальшавіцкія тэмпы.

Апартуніст Піліпенка ахоўвае кулакоў

Апартуністы з фінчасткі ў Чашніцкім раёне зрываюць выкананьне фінпляну. У то й час, калі з калгасаў спагнаны падаткі, з індывідуальнага сэктару яшчэ нават не спагнаны абавязковыя плацяжы і страхоўка.

Калі ўзяць рэалізацыю акцый Трактарацэнтру, дык і тут плян сарваны таму толькі, што фінчастка ўсю кантрольную лічбу зьвярнула на калгасы, а аднаасобнаму сэктару зусім нічога не дала.

Цікава тое, што загадчык фінчасткі Піліпенка, калі ён робіць інфармацыю па мабілізацыі сродкаў, дык нікоі не ўспамінае аб націску на кулака, а заўсёды гаворыць, што сацыялістычны сэктар грошы ня ўносіць і неабходна аддаваць пад суд. За кепскую рэалізацыю акцый Трактарацэнтру зь несена суровая вымова фракцыі райкалгасаўцу, а калі фракцыя РВС настойліва патрабавала разьбіўкі пляну, а таксама адначыць, што з кулацка-заможнай часткі яшчэ не спагнаны абавязковыя плацяжы і што гэта ўсё ўваходзіць у мабілізацыю сродкаў, дык Піліпенка сказаў, што аднаасобнікі трактарам карысна для ня будуць і яны не павінны абавязацельствы браць, а таму і фінчастка не адчувае за сабой віны па рэалізацыі акцый.

Адносіны Піліпенкі да калгаснай сыстэмы характарызуюцца яшчэ тым, што калі праводзіўся зьезд калгаснікаў, а памяшканьня ня было, дык Піліпенка памяшканьня РВК ня даў, тлумачачы тым, што нельга калгаснікаў пусьціць у залю РВК, бо яны, бачыце, забруднуць сцены, якія пафарбаваны масьляной фарбай.

Трэба такога апартуніста зьняць з работы і даць адпаведнае спагнаньне.

Калёнае жалеза.

Нашым сталым карэспандэнтам,

рабселькорам і ўдарным брыгадам „Сав. Беларусі"

Набліжаецца сьвята 1-га мая і дзень друку (5-га мая). Гэтыя дні мы павінны адзначыць перамогамі па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва і наступленьня на капіталістычныя элементы. Арганізуйце падачу матар'ялаў па наступных пытаньнях:

Як праходзіць калектывізацыя (рост у лічбах у процантах), як падрыхтаваны да сяўбы (пераход на зьдзельшчыну, пераход на брыгадную работу, сацспаборніцтва і ўдарніцтва памiж брыгадамі і г. д.), аб рабоце вытворчых нарадах у калгасе, на заводзе і фабрыцы і аб іх канкрэтных выніках.

Як праходзяць гаспадарча-палітычныя кампаніі (кантрактацыя, лёна і бульбазагатоўкі, лесасплаў, мабілізацыя ўнутраных сродкаў), аб дасягненьнях па выкананьні прамфінпляну, якасьць прадукцыі і зьніжэньні сабекошту.

Паказвайце рост партыі і барацьбу за адзінства партыі (барацьба з правымі „левымі" ухілам), шлеце матар'ялы па нацыянальным пытаньням.

Вялікую каштоўнасьць мае абмен вопытам сацыялістычных мэтадаў працы, таму паказвайце не толькі аб тым, што дасягнута, але і як, якімі мэтадамі дасягнута.

Абавязкова паказаць, які непасрэдны ўдзел прымаюць ва ўсіх гэтых пытаньнях рабселькоры і ўдарныя брыгады рабселькораў (колькі імі арганізавана новых калгасаў, ліквідацыя прарываў і г. д.).

Матар'ялы шлеце хутчай поштай.

Сэктар рабселькораў і ўдарных брыгад газ. „Сав. Бел.".

УСЕСАЮЗНАЯ РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧКА ПА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЕ.

МАСКВА, 23. Закончылася ўсесаюзная радыё-пераклічка па зьдзельшчыне ў колгасах, організаваная Колгасцэнтрам, газэтамі „Правда", „Социалистическое земледелие", и „Крестьянская газета по радио". Выступленьні колгасьнікаў паказалі, што колгасы правільна зразумелі сэнс зьдзельшчыны і правільна ўжываюць організаваную працу. Многія колгасы вылучылі спэцыяльных організатараў працы, стварылі курсы і брыгады. На пераклічцы адзначаны памылкі ў правядзеньні прынцыпу зьдзельшчыны. У некаторых выпадках складаюць вельмі буйныя брыгады з 100—200 двароў, замест нормальнай брыгады ў 20—40 чалавек. Некаторыя колгасы недаацанілі жаночую працу і лічаць, што жанчына в работай у пасеўную кампанію ня зможа справіцца. У тых колгасах, дзе праводзіцца строга організаваная праца пры пераходзе на зьдзельшчыну павялічылася норма выпрацоўкі: калі раней адзін чалавек за два дні закладаў адзін парнік, дык пры зьдзельнай працы ён ужо закладае адзін парнік у $1\frac{1}{2}$ дні. Тое-ж самае і ў малочнай гаспадарцы. Калі работніца выдойвала у працоўны дзень 81 літр малака, дык пры пераходзе на зьдзельную працу яна стала выдойваць 104 літры. Кулакі спрабуюць разлажыць брыгады і пускаюць хлусьлівыя чуткі. Колгасьнікі ведуць рашучую барацьбу з кулаком і яго агентурай.

Па БССР

Ляднянская ШНМ організавала 6 брыгад па зачыстцы насеннага фонду, а таксама па оборы попелу, лому і жалеза і наогул утыльсыравіны. Апроч таго, школай былі пасланы 5 брыгад для выхаду ў вёску для правядзеньня антыялігіёзнай кампаніі. Вылучана школай 3 брыгады для ўзядзеньня растлумачальнай работы і вярбоўкі ў калгасы.

Ва ўсёй гэтай рабоце актыўны ўдзел трыма камсамольская ячэйка школы і сучнёўскі актыў.

К. К.

За сакавік месяц у калгас «Слава» уступіла 24 гаспадарні і 4 адзіночкі.

Адтак, на сёньняшні дзень некаторыя беднякі і сераднякі знаходзяцца пад уплывам кулакоў і падкулачнікаў, якія запалохваюць сваёй агітацыяй адзіначкоў. Асабліва выявілі сябе ў гэтым Сёмка А. А., Злобіч, Расоха і Кедыч Ф., якія праводзяць прыпаўзкі ходы, каб як-небудзь затрымаць рух калектывізацыі. Хоць Ляднянская агітацыя ня мае ўплыву на асноўную масу бедняцкую і сераднякоў, але ўсё-ж такі сельсавет павінен яшчэ больш узмацніць работу сярод беднаты, каб даць належны рэўпуючы адпор кулакам і падкулачнікам. Гэта забясьпечыць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб учынгіненьні ў калгас 30 проц. бядняцка-сераднякоў гаспадарак да часу веснавой пасеўнай кампаніі і 46 проц. да канца 1931 г.

Трускін.

Майстар Ліўшыц зрывае практыку вучобы

19 красавіка група студэнтаў фізтэхнікуму ВДУ ў ліку 4 асоб зьявілася на завод «Дрэваапрацоўшчык» на практыку ў мэханічны цэх. Трох чалавек—практыкантаў мастар зараз-жа адправіў дамоў, гаворачы: «Ня было ніякай дагаворанасьці аб вашым зьяўленьні. Працы няма».

Мяне майстар паставіў памочнікам варштату фрэзера-шыпарэзнага варштату (адзін памочнік там быў).

Патрадаваць на варштаце мне дазволіў, варштатны, але ў час мае працы да варштату прыбег майстар і ку Ліўшыц і спаў лаяцца: «Хто та дазволіў працаваць?.. Аслабані цэх Не перашкаджай...

Калі я хацеў з ім пагутарыць, то і яшчэ раз крыкнуў: «Не перашкаджа аслабані цэх зараз-жа!..

Стральчэня П. В.

А Б' Я В А

У сувязі з пераходам на новую форму крэдытаваньня з 1 мая г.г прапануецца ўсім гаспадарчым і грамадзкім арганізацыям, маючым кантакарэнтныя рахункі ў Белканторы Дзяржбанку,

прадставіць

У АПЭРАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ КАНТОРЫ

у 3-дзённы тэрмін

УЗОРЫ ПОДПІСАЎ АСОБ

упаўнаважаных падпісваць ад імя гэтых арганізацый, у 3-х экзэмплярах.

Бланкі для узораў подпісаў павінны быць атрыманы у Апэрацыйным Аддзеле Канторы ў часы занятках.

Непрадстаўленьне патрабуемага можа пацягнуць спыненьне выплат

Дзяржаўны банк. Белкантора і Менскае Гараданое Аддзяленьне

Менская кантора „САЮЗТРАНС'у"

ПАВЕДАМЛЯЕ

кліентуру, што яна павінна зьявіцца ў

Менскую кантору

(Маскоўская 3, каля чыгуначнага маста),

МАЮЧЫ З САБОЮ НА РУКАХ ПЛЯН ПЕРАВОЗАК НА 1931 ГОД

ДЛЯ ЗАКЛЮЧЭНЬНЯ ДАГАВАРОЎ.

Незаключэньне дагавораў да 25-га красавіка выклікае спыненьне Саюзтрансам абслугоўваньня

Менская кантора.

Галоўлітбел № 508.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.